ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр
і сетка публічных бібліятэк”

**2023**

**Красавік**

# Бібліятэчны веснік














**Інфармацыйны веснік**

# Красавік

**4**

**1 красавіка** адзначыла свой 75-гадовы юбілей паэт, празаік, публіцыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Саюзнай дзяржавы, Саюза расійскіх пісьменнікаў**,** старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Краснова-Гусачэнка. Да гэтай даты ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** была афармлена **кніжная выстава “На одном дыхании”,** на якой прадстаўлены кнігі паэтэсы і звесткі з яе біяграфіі.




**Кніжная выстава**
**“Со мною вечность говорит”**
**Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка**

Дзень смеху – гэта не толькі самае вясёлае, але і добрае свята, а значыць, усе эмоцыі, якія адчуваюць людзі падчас розыгрышаў павінны выклікаць радасць**. 1 красавіка** ў **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** ў рамках міні-праекта “Каникулы в библиотеке” прайшоў **конкурс малюнкаў “Давайте посмеёмся**”. Малюнкі атрымаліся розныя, але аб'яднала іх тое, што ўсе яны былі намаляваны з гумарам.





**1 красавіка** дзяцей, якія наведвалі ў час вясенніх канікул школьны лагер пры ДУА “Межанская сярэдняя школа імя А. Я. Казлова”, запрасілі ў **Межанскую бібліятэку-клуб** на **смех-тайм “Веселый час в библиотеке”,** прымеркаваны да Дня смеху. Удзельнікам распавялі адкуль да нас прыйшло гэтае свята і чаму яно адзначаецца менавіта 1 красавіка. Усе разам удзельнічалі ў вясёлых віктарынах, чыталі скорагаворкі, спявалі песні, гулялі ў вясёлыя гульні.

**1 красавіка** ў **Руднянскай бібліятэцы-клубе** адбыўся **вечар адпачынку “Посмеёмся вместе”.** На працягу вечара гучалі жарты, забаўляльныя гісторыі з жыцця, розыгрышы.

**1 красавіка** ў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** адбыўся **майстар-клас “Жучок”** для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Малахитовая шкатулка”. На працягу занятку быў створаны жучок з бісера.




**1 красавіка ў Віраўлянскай сельскай бібліятэцы да** Міжнароднага дня птушак для ўдзельнікаў экалагічнага клуба “Вировлянские экологи” прайшоў **Дзень крылатых насельнікаў**. Для ўдзельнікаў была аформлена **выстава тэматычнай літаратуры “Чароўны свет птушак”**. Сапраўдную цікавасць прысутных выклікала **гульнёвая праграма “У каждой пташки свои замашки”**. Бібліятэкар узгадала аб рэдкіх птушках, занесеных у Чырвоную кнігу нашай краіны, пра навуку арніталогію, якая займаецца вывучэннем птушак. Была падрыхтавана **цікавая віктарына “Пернатый народец”.** Мерапрыемства мела важнае выхаваўчае значэнне. Яно дапамагло дзецям яшчэ раз яскрава адчуць і зразумець значэнне птушак у прыродзе і неабходнасць іх захавання. У канцы дня прайшла **акцыя “Скворечник”** і ўсе разам вывешалі шпакоўні, якія дзеці вырабілі разам са сваімі татамі і дзядулямі.

**Дубраўская сельская бібліятэка** працягвае работу па рэалізацыі міні-праекта для дзяцей пачатковых класаў “Мир пернатых и зверей ждёт поддержки от друзей”. Так у красавіку да Дня абароны птушак прайшоў **пазнавальны ўрок** пад назвай “**Птичкин праздник**”. Дзеці прымалі ўдзел у гульнях,адказвалі на пытанні віктарыны і папаўнялі свае веды аб тым, якія птушкі жывуць у Беларусі, якія застаюцца зімаваць, а якія прылятаюць да нас вясной. Таксама бібліятэкар расказала прысутным аб найважнейшым экалагічным свяце – Міжнародным дне птушак.



**2 красавіка** ў Межанскай бібліятэцы-клубе для дзяцей, якія наведвалі ў час вясенніх канікул школьны лагер пры ДУА “Межанская сярэдняя школа імя А. Я. Казлова”, была арганізавана экалагічная гульня-віктарына “Наши пернатые друзья”, прысвечаная Міжнароднаму дню птушак. Каб больш даведацца пра жыццё птушак і адкрыць некаторыя птушыныя сакрэты, прысутныя з вялікім задавальненнем прымалі ўдзел у розных гульнях і віктарынах, а затым усе разам пайшлі карміць птушак. Была аформлена кніжная выстава-знаёмства “Птицы нашего края”.





**2 красавіка** да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі **ў бібліятэках Гарадоцкай сеткі** афармляліся выставы, на якіх былі прадстаўлены кнігі і інфармацыя аб гісторыі, культуры, палітыцы дзвюх краін, а таксама аб сумесных праектах і дасягненнях у навуцы, тэхналогіях, спорце і эканоміцы. На некаторых з іх можна ўбачыць і фатаграфіі, якія адлюстроўваюць важныя падзеі і моманты з гісторыі дзвюх краін.




Кніжная выстава
“Беларусь – сестра России”
Межанская библиотека-клуб




Выстава-каляндар
“Беларусь и Россия – единое целое”
Дубраўская сельская бібліятэка




Кніжная выстава
“Мы разам, мы вместе”
Пальмінская сельская бібліятэка




Выстава-каляндар
“Садружнасць без межаў”
Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка




Тэматычная кніжная паліца
“Союзное государство: Беларусь и Россия – шаг в будущее”
Долгопольская сельская библиотека

**2 красавіка** да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** для дзяцей прайшла **гадзіна-разважанне “Звязаныя адным лёсам”.** На мерапрыемстве размова вялася аб партнёрстве дзвюх дзяржаў, пра адносіны да рускай і беларускай моў. Увага была ўдзелена таму, на чым будуюцца адносіны паміж нашымі народамі, аб адзінстве поглядаў на сучасную гісторыю. Таксама ў ходзе мерапрыемства было пашырана ўяўленне аб паняцці “сяброўства” паміж народамі Беларусі і Расіі.

**2 красавіка** ў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** была арганізавана **медыяэкскурсія “Псков Гандейский”** да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Карыстальнікам бібліятэкі была прапанавана медыяэкскурсія аб гісторыі і славутасцях горада.



Гадзіна інфармацыі “Два народа, одно дыхание”
Верамееўская сельская бібліятэка

У чытальнай зале прайшоў прававы прафсаюзны прыём грамадзян, які правёў



прававы інспектар абласнога камітэта прафсаюза работнікаў культуры, спорту і турызму С. А. Мандрык у прысутнасці памочніка пракурора Гарадоцкага раёна С. А. Камінскага і старшыні раённага аб'яднання прафсаюзаў Л. М. Пальчыкавай. Як і любы тыповы прыём грамадзян, прававы прафсаюзны прыём прызначаны для таго, каб людзі маглі атрымаць дапамогу і кансультацыю па сваіх пытаннях ад юрыстаў ці іншых спецыялістаў у галіне права і прафсаюзаў.

**2 красавіка** Тыдню дзіцячай кнізе было прымеркавана чарговае паседжанне дзіцячага клуба “Почемучки” **– вусны часопіс “Похвала книге” у Верамееўскай сельскай бібліятэцы.** Размова ішла аб гісторыі ўзнікнення кнігі, аб тым, людзі якіх прафесій удзельнічаюць у яе стварэнні. Дзеці адказвалі на пытанні займальнай віктарыны, успомнілі прыказкі і загадкі.




**2 красавіка** ў **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** ў рамках міні-праекта “Каникулы в библиотеке” прайшоў **майстар-клас па вырабе куранят з паперы і нітак “Весёлые цыплята**”. У выніку атрымаліся выдатныя папяровыя яйкі, у якіх дзеці схавалі куранят.



**2 кастрычніка** для маленікіх чытачоў у **Прудніцкай сельскай бібліятэцы** адбылося **поле цудаў па казкам “Волшебники из детства”.**




**5 красавіка** да Міжнароднага дня дзіцячай кнігі ў Віраўлянскай сельскай бібліятэцы адбылося **свята кнігі** “**Книга – наш лучший друг”** для навучэнцаў ДУА “Віраўлянская пачатковая школа-сад”. Пачалося мерапрыемства з чытання вершаў аб кнігах. Бібліятэкар расказала пра гісторыю свята, затым прысутныя ўдзельнічалі ў літаратурных конкурсах і віктарынах, жартоўных гульнях, адгадвалі загадкі. Успомнілі прыказкі і прымаўкі аб кнігах і чытанні, правілы абыходжання з кнігай. Была афармлена **кніжная выстава “Кніга – крыніца ведаў”.**




**4 красавіка** да Сусветнага дня здароўя ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** для дзяцей прашла **гульня-віктарына “Здароўе: шкодныя звычкі”.** У ходзе мерапрыемства дзеці адказвалі на пытанні віктарыны, успаміналі прыказкі і прымаўкі, называлі карысныя прадукты для арганізма і шкодныя, адгадвалі загадкі. Таксама ўдзялілі ўвагу такой шкоднай звычке, як няправільная пасадка пры пісьме, чытанні. Завяршылі мерапрыемства тэматычным аглядам літаратуры.

**5 красавіка** у **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** адбылася **прафілактычная сустрэча з участковым інспектарам міліцыі** Семчанкай Янінай Аляксееўнай **“Остановись и подумай!”** для навучэнцаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава”. Прадстаўнік РАУС правяла гутарку аб правілах паводзін падчас канікулаў, паводзінах навучэнцаў у школе і ў пазаўрочны час, расказала аб адказнасці за правапарушэнні непаўналетніх.







**7 красавіка** адзначаецца Сусветны дзень здароўя, які накіраваны на прыцягненне ўвагі кожнага жыхара нашай планеты да праблем здароўя і яго аховы, з мэтай правядзення сумесных дзеянняў для абароны здароўя і дабрабыту людзей. Аб гэтым гаворка ішла **6 красавіка** ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы, дзе бібліятэкары арганізавалі для дзяцей, якія наведвалі школьны лагар “Дружба” пры ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М. Антонава” **спартыўна-забаўляльную праграму “Молодое поколение выбирает здоровье”.** Прысутныя ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах і спартыўных эстафетах, адказвалі на пытанні віктарыны. У гэтай жа бібліятэцы **7 красавіка** да Сусветнага дня здароўя прайшла **спартыўная хвілінка “Не ленись! Оздоровись”**. Бібліятэкары надалі ўвагу чытачам пажылога ўзросту. Пагаварылі аб тым, што важна правільна харчавацца, весці актыўны лад жыцця, выканалі гімнастыку з 11 простых практыкаванняў для людзей пажылога ўзросту. Абмеркавалі **кніжную выставу “Все о здоровье”.**



**5 красавіка** напярэдадні Сусветнага дня здароўя ў **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** прайшла **гульня-віктарына** “**Здоровый образ жизни**”. Бібліятэкар расказала дзецям пра гісторыю ўзнікнення свята – Сусветнага дня здароўя і прапанавала здзейсніць невялікае падарожжа ў “краіну Здароўя” з дапамогай вясёлых конкурсаў і віктарын. Па дарозе яны пазнаёміліся са складнікамі здароўя: фізкультурай, карыснай ежай, гігіенай і рэжымам дня. Удзельнікам мерапрыемства цікава было адгадваць “гігіенічныя загадкі” і адказваць на “спартыўныя пытанні” віктарыны “Спорт – ты сила”. Таксама для дзяцей прагучалі прыказкі і прымаўкі аб здаровым ладзе жыцця. Потым бібліятэкар расказала пра паэтаў, якія ў сваіх вершах вучаць дзяцей клапаціцца пра сваё здароўе: В.У. Маякоўскі “Что такое хорошо, и что такое плохо?”, К.І. Чукоўскі “Мойдодыр”, “Федорино горе”. Мерапрыемства прайшло весела і цікава.




Да Сусветнага дня здароўя ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбылася гадзіна здароўя “Будьте здоровы!”. Бібліятэкар прапанавала ўдзельнікам сустрэчы пагаварыць аб тым, што мы самі можам зрабіць для ўмацавання свайго здароўя, якія фактары ўплываюць на яго ўплываюць.. Вядучая нагадала, што вельмі важна весці актыўны і здаровы лад жыцця, займацца фізкультурай і спортам, выконваць правілы асабістай гігіены. У мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Гарадоцкага раёна. Валеолаг Марына Палянская расказала пра згубны ўплыў электронных цыгарэт на здароўе чалавека і статыстыку пацярпелых ад «вэйпаў». А памочнік лекара эпідэміёлага Хадакова Зоя Канстанцінаўна распавяла аб сезоннай небяспецы для здароўя чалавека – кляшчах і спосабах абараніць сябе падчас шпацыраў у лесапаркавых зонах. Таццяна Шукалава, работнік Белдзяржстраха, падрабязна расказала, як можна застрахаваць сваё здароўе ад няшчасных выпадкаў і захворванняў. У фае бібліятэкі дзейнічала **кніжная выстава “Библиотека здоровья”.**





Да Сусветнага дня здароўя **ў Межанскай бібліятэцы-клубе** для карыстальнікаў была падгатавана **выстава-кансультацыя “От пищи полезной не будет болезней”.** На ёй была размешчана літаратура аб здаровым харчаванні, здаровым ладзе жыцця і карысці фізічнай культуры.

**7 красавіка,** у Сусветны дзень здароўя, у **Межанскай бібліятэцы-клубе** для дзяцей прайшла **пазнавальна-гульнявая праграма “Детям о здоровье”.** Дзеці пазнаёміліся з “рэцэптамі” здароўя, ўспомнілі прыказкі, даведаліся аб правільным харчаванні, адгадвалі загадкі пра вітаміны, яшчэ раз паслухалі аб уплыве на наше здароўе шкодных звычак. Прысутныя дружна ўдзельнічалі ў конкурсах “Измерь температуру соседу”, “Делай как я” і інш.

**8 красавіка** для дзяцей у **Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** была праведзена **гульня-падарожжа “Доброе дело питает разум и тело”** да Сусветнага дня здароўя. Прысутныя разам з бібліятэкарам адправіліся ў імправізаванае падарожжа ў краіну Здароўя. У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі “пабывалі” на прыпынках “Неболейка”, “Физкультура”, “Всезнайка”, “Аппетитная”, “Олимпиёнок”.

**14 красавіка** бібліятэчны квіз “К здоровью наперегонки” быў арганізаваны ў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** да Сусветнага дня здароўя. Навучэнцы 3 класса ГУО “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Анціпава” падзяліліся на дзве каманды: “Неболейки” і “Крепыши”. Дзеці спаборнічалі паміж сабой, адгадвалі загадкі, рабілі зарадку пад музыку, складалі прыказкі аб здароўі, гулялі ў гульню “вредно-полезно”, а яшчэ даведаліся хто з іх вясялей смяецца.









**11 красавіка** Да Міжнароднага Дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў бібліятэкар **Віраўлянскай сельскай бібліятэцы** падрыхтавала **выставу-рэквіем “Гэта нельга забыць…”,** на якой былі прадстаўлены дакументальныя аповесці, успаміны былых вязняў канцлагераў, якія расказваюць пра жах фашысцкага зняволення і гераічную барацьбу антыфашыстаў усіх нацыянальнасцей.

**12 красавіка** ў **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы** да юбілею А.М.Астроўскага для чытачоў была аформлена **кніжная выстава** “**Великий мастер русской драмы**”. У склад выставы ўвайшлі літаратуразнаўчыя матэрыялы, прысвечаныя жыццю і творчасці А. М. Астроўскага, яркія выказванні крытыкаў, даведнікі па мясцінах Расіі, звязаных з жыццём вялікага драматурга, а таксама ўспаміны сучаснікаў. Чытачы пазнаёміліся з творамі Астроўскага: камедыямі, драматычнымі п'есамі і прозай. У іх умясцілася ўсё жыццё Расіі 19 стагоддзя, яе побыт, яе норавы, яе гісторыя.




**12 красавіка** ўдзельнікі клуба “Добрые встречи” сабраліся на чарговае паседжанне ў **Сцяпанавіцкаю сельскую бібліятэку на літаратурна-музычны круіз “Великий песенник”.** Мерапрыемства было прымеркавана да 85-годдзя паэта-песенніка, народнага артыста Іллі Рэзніка. Прысутныя даведаліся пра бібліяграфічныя звесткі з жыцця гэтага знакамітага чалавека. Са здавальненнем разам паслухалі запісы ўсіх песен,  разам падпявалі знаёмыя радкі.

**14 красавіка** ў чытальнай зале **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для маленькіх выхаванцаў ДУА “Яслі-сад №2 г. Гарадка” прайшла **літаратурная гадзіна “Дзівоснае побач з намі”,** прысвечаная беларускай пісьменніцы – казачніцы А. Масла. Алена Масла піша казкі для дзяцей і падлеткаў. Друкавалася ў часопісах “Маладосць”, “Дзеяслоў”, “Вясёлка”, газеце “Літаратура і мастацтва” і інш.. З’яўляецца аўтарам кніг і шэрагу публікацый у перыёдыцы на тэму развіцця беларускай дзіцячай літаратуры. Падчас мерапрыемства бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з біяграфіяй і творчасцю пісьменніцы, прачытала ім услых некалькі яе казак. Дзеці з вялікім задавальненнем слухалі бібліятэкара, гулялі ў вясёлыя гульні і конкурсы, адгадвалі загадкі. А напрыканцы сустрэчы ўсім прысутным быў паказан лялечны пасхальны спектакль “Цуда для Насці”.








**14 красавіка** ў **ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”** сабраліся тыя, хто рыхтуецца ўступіць у рады Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Адправіць маладых хлопцаў на службу, даць слова на дарогу і




ўручыць падарункі прыйшлі старшыня райвыканкама Ірына Палякова, старшыня райсавета дэпутатаў Святлана Зуева, ваенны камісар Аляксандр Волкаў, протаіерэй Уладзімір Дагодзька і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Супрацоўнікамі бібліятэкі была аформлена **бібліятэчная выстава “Квітней, Беларусь!”.**

**Бычыхінская сельская бібліятэка** працягвае работу па праекце “Адкрый для сябе беларускую кнігу”. Адным з галоўных напрамкаў яго з’яўляецца далучаць дзяцей да беларускай спадчыны, кнігі. **14 красавіка** бібліятэкары правялі для дзяцей **літаратурна-пазнавальную хвіліну “Светачы зямлі беларускай”.** Дзеці даведаліся аб асветніках беларускай зямлі, іх вялікім ўкладзе ў культурнае развіццё роднай зямлі.



**14 красавіка** да Вялікадня бібліятэкар запрасіла ў **Верхоўскую сельскую бібліятэку** ўдзельнікаў клуба “Святліца” на **гадзіну адпачынку “Святкаванне Вялікадня на Беларусі”.** Жанчыны падзяліліся сваімі ўспамінамі аб тым, як святкавалі Вялікдзень іх бабулі і дзядулі. А потым вялі размову аб звычаях і абрадах, якія захаваліся ў цяперашні час.

**14 красавіка** да 115-годдзя з дня нараджэння І. Яфрэмава ў **Верхоўскай сельскай бібліятэцы** для прысутных была праведзена **гутарка каля кніжнай паліцы “Дорога к звёздам”.** Удзельнікі коратка пазнаёміліся з біяграфіяй гэтага цудоўнага пісьменніка-фантаста, абмеркавалі кнігі аўтара прадстаўленыя на выставе.

Напярэдадні Вялікадня ў **Дубраўскай сельскай бібліятэцы** сабраліся маленькія чытачы, тут адбыўся **ўрок духоўнасці “Светлое воскресенье”.** Падчас мерапрыемства гаворка ішла аб галоўным для праваслаўных людзей святе. Дзеці слухалі расказ бібліятэкара аб зямным шляху Ісуса Хрыста, даведаліся аб абрадах і звычаях Вялікоднага тыдня.

Супрацоўнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** ў рамках Вялікоднага тыдня, арганізаванага Гарадоцкім благачыннем, прынялі ўдзел у **дабрачыннай акцыі “Навстречу детским сердцам”,** якая праходзіла ў ДУК “Гарадоцкі гарадскі Дом культуры”. Бібліятэкары арганізавалі **выставу творчых работ “Пасхальное яйцо – 2023”, выставы “Пасхальная радость” і “Духовной радости сияние”.** Былі падведзены вынікі творчага конкурсу “Пасхальное яйцо – 2023”, раней






аб'яўленага бібліятэкай і ўручаны дыпломы і падарункі. Таксама метадысты бібліятэкі распрацавалі раённы конкурс на лепшы сямейны **відэаролік “Светлый праздник Пасха в моей семье”.** На мерапрыемстве былі паказаны лепшыя відэаролікі, а падарункі пераможцам былі прадастаўлены Гарадоцкім раённым аб'яднаннем прафсаюзаў.



**Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка** прыняла ўдзел у **раённым конкурсе** на лепшы макет царквы Гарадоцкага раёна **“Макетирование Городокских храмов”**. Макет “Храм святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны ў вёсцы Халамер'е” (аўтар Шышкоў А. Л) быў прызнаны лепшым сярод іншых удзельнікаў конкурсу. Суддзі адзначылі высокую тэхнічную і мастацкую працу аўтара, а таксама яго ўменне перадаць духоўную атмасферу храма.




**15 красавіка ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы** да Вялікадня для жыхароў вёскі прайшоў **інфармацыйны час "Пасхи день святой".** Бібліятэкар запрасіла ў бібліятэку святара з храма Андрэя Першазванага Гарадоцкага Благачыння. Ен павіншаваў прысутных са святам, асвяціў вялікодныя яйкі і кулічы.

**14 красавіка ў Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** прайшлі **праваслаўныя хвіліны "Вялікі і светлы пасхальны звон",** прымеркаваныя да Вялікадня. Мерапрыемства ўключыла ў сябе спалучэнне інфармацыі аб народных вялікодных традыцыях, царкоўнай абраднасці і гісторыі свята. Удзельнікі мерапрыемства ўспомнілі, якія традыцыі святкавання Вялікадня захаваліся і ў наш час, а таксама падзяліліся сваімі сямейнымі традыцыямі.



**15 красавіка ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для ўдзельнікаў клуба "Истоки" адбылося чарговае паседжанне – **майстар-клас "Пасхальныя узоры".** Бібліятэкары сумесна з дзецьмі ўпрыгожвалі вялікодныя яйкі.

**16 красавіка ў Межанскай бібліятэцы-клубе** адбылося чарговае паседжанне клуба сямейнага чытання "Дружная семейка". Для дзяцей і іх бацькоў прайшла **гадзіна духоўнасці "Дорого яичко к Христову Дню",** дзе прысутных пазнаёмілі з вялікоднымі традыцыямі і сімваламі, народнымі павер'ямі і такімі святамі як: Вербная нядзеля, Чырвоная горка.



**19 красавіка** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшлі II раённыя Вялікодныя адукацыйныя чытанні “Чудо выше всех чудес”.** Удзел у іх прынялі навучэнцы школ горада і раёна. Свае даклады аб гісторыі кнігадрукавання і першадрукарах Беларусі, аб святых гарадоцкай зямлі, прадставілі 18 удзельнікаў. Удзельнікамі камісіі сталі: іерэй Уладзімір Дагодзька, іерэй Стахій Кісялёў, іерэй Аляксандр Кананович, іерэй Вячаслаў Зайцаў, намеснік дырэктара ГУДА “Гарадоцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі” Марыя Дарафеева, намеснік дырэктара ДУА “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк” Іна Адаменка. Яны падвялі вынікі і ўзнагароджанне аўтараў лепшых работ. У фае была арганізавана кніжная выстава “Пасхальная радость”, а таксама выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Пасхальное яйцо – 2023”.








**15 красавіка** супрацоўнік **Межанскай бібліятэкі-клуба** арганізавала **танцавальна-забаўляльную праграму “В ритме 90-х”.** У ходзе мерапрыемства прайшлі конкурсы, віктарыны на веданне папулярных мелодый і кампазітараў 90-х гадоў, рухомыя гульні і, вядома ж, танцавальны нон-стоп.



**18 красавіка** прайшоў **майстар-клас “Волшебные ручки”,** які быў арганізаваны ў **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Малахитовая шкатулка”. На працягу мерапрыемства удзельнікі рабілі вырабы з пацерак і паперы.



**20 красавіка** бібліятэкарамі **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** для навучэнцаў 4 класа ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Анціпава”, якія з’яўляюцца ўдзельнікамі экалагічнага клуба “Лесавічок”, было арганізавана **экалагічнае асарці “Волшебный лес полный чудес”,** прыурочанае да Міжнароднага дня лясоў. Падчас мерапрыемства дзеці падзяліліся на каманды і ўдзельнічалі ў віктарынах і гульнях. Успомнілі правілы паводзін у лесе, прыказкі, складалі словы. А ў завяршэнне мерапрыемства быў прадстаўлены відэа-ролік “Удивительные деревья мира”.

**22 красавіка** маленькія чытачы былі запрошаны ў **Сцяпанавіцкую сельскую бібліятэку на экалагічную гульню “Мы дети твои, дорогая земля”** да Сусветнага дня Зямлі. У час мерапрыемства дзеці даведаліся аб асноўных экалагічных праблемах сучаснасці, аб забруджванні вады і паветра, аб незаконным знішчэнні лясоў. Удзельнікі адгадвалі пытанні віктарыны, удзельнічалі ў конкурсах: “Вопрос-ответ”, “Если я приду в лесок”.

**21 красавіка** ў літаратурна-музычнай гасцінай **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбыўся **паэтычны спектакль “В краю светозарной земли”.** У яго аснову леглі рэальныя гісторыі з элементамі аўтабіяграфіі нашай зямлячкі Наталлі Саветнай – паэткі, празаіка, публіцыста, крытыка, члена Саюзаў пісьменнікаў Беларусі, Расіі, Саюзнай дзяржавы. Спектакль прадставілі артысты Мінскага гарадскога тэатра паэзіі пад кіраўніцтвам Міхаіла Пазнякова. Аўтар выканала галоўную ролю. Успаміны аб дзяцінстве, юнацтве, аб родных людзях і мясцінах, суседзях, хатцы ў вёсцы гучалі не толькі ў вершах, але і ў песнях у выкананні мясцовых бардаў і артыстаў з горада Мінска. Спектакль стаў сапраўдным падарункам для жыхароў горада рознага ўзросту, кожны выпрабаваў мора эмоцый, пазнаючы родныя мясціны, угадваючы падзеі.





**23 красавіка** для ўдзельнікаў клуба “Зеленая беседка” **(Вiраўлянская сельская бібліятэка)** адбылася **гадзіна кведкаводства “Роза – царица цветов”,** на якой бібліятэкар расказала прысутным аб вырошчвані руж, аб тым як правільна зняць зімовае уцяпленне, аб прафілактыцы хвароб. Сваім вопытам па догляду “царыцы кветак” падзялілася ўдзельніца клуба Забалотнік В. Яна паведаміла аб абрэзцы руж вясной, аб сартах якія растуць на яе прысядзібным участку. Таксама бібліятэкар правяла для прысутных агляд часопіса “Домашние цветы”.




**26 красавіка** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** прайшло мерапрыемства – **рэха памяці “Бедой зажжённое слово”,** прымеркаванае да 37-й гадавіны з дня трагедыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы каледжа, перад якімі выступіў ветэран МУС А. І. Зюсько, расказаўшы прысутным сваю гісторыю службы ў зоне адчужэння, і адказаў на пытанні хлопчыкаў і дзяўчынак. Намеснік начальніка Гарадоцкага РАУС падпалкоўнік міліцыі Міралюбава Н. В. выказала словы падзякі Аляксею Іванавічу за самаадданасць, вернасць прысяге пры выкананні службовага абавязку ў няпростых умовах і ўручыла памятны падарунак. А ў фонд цэнтральнай бібліятэкі Наталля Уладзіміраўна падарыла ўнікальнае выданне “Опалённые Чернобылем” пра ліквідатараў аварыі з Віцебскай вобласці. Усе з цікавасцю праглядзелі відэафільм “Витебские ликвидаторы”. Чарнобыльская трагедыя знайшла сваё адлюстраванне ў літаратурных творах беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі правяла літаратурны агляд “Чернобыльское эхо”, падчас якога расказала пра самыя цікавыя з іх, зачытваючы ўрыўкі з рамана І. Шамякіна “Злая зорка”, Ніны Рыбік “Эвакуация” і інш.






**26 красавіка** для чытачоў **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі** была арганізавана **выстава-напамін “Мы сегодня слышим сквозь года, Чернобыля трагические звоны”** на якой прадстаўлены мастацкія творы, якія расказваюць пра самую вялікую ў гісторыі чалавецтва тэхнагенную катастрофу, а таксама выразкі з газет.



**26 красавіка** бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** правялі для моладзі **інфармацыйную гадзіну “Урокі Чарнобыля: погляд праз дзесяцігоддзі”,** да дня Чарнобыльскай трагедыі. На мерапрыемства была запрошана Л. У. Барсукова, якая жыла і працавала ў зоне высялення, калі здарылася Чарнобыльская трагедыя. Яна стала сведкам тых жудасных падзей і расказала свае ўспаміны прысутным на мерапрыемстве.



Да дня Чарнобыльскай трагедыі ў **Дубраўскай сельскай бібліятэцы** для навучэнцаў ДУА “Вышацкая сярэдняя школа ім. Н. І. Гапеёнка” было арганізавана мерапрыемства – **інфарм-дасье “Чарнобыль – боль нашай зямлі”.** Прысутныя даведаліся пра падзеі вясны 1986 года, падрабязнасці трагедыі, якая стала выпрабаваннем для мільёнаў людзей. Таксама гаворка ішла аб героях, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі аварыі.

**26 красавіка** да Дня Чарнобыльскай трагедыі ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** карыстальнікам была прапанована **выстава-агляд “Беларусь у промнях Чарнобыля”.** Прысутныя пазнаёміліся з творамі, у якіх асвяшчаецца ўся боль чарнобыльскай трагедыі. Бібліятэкар зачытвала з кніг самыя кранальныя ўрыўкі і вершы.

**26 красавіка** да Міжнароднага дня памяці ахвяр радыяцыйных аварый і катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у **Межанскай бібліятэцы-клубе** была праведзена **інфармацыйная гутарка “Эхо Чернобыля”**. Навучэнцаў ДУА “Межанская сярэдняя школа імя А. Я. Казлова” пазнаёмілі з трагедыяй, якая здарылася на Чарнобыльскай АЭС і яе наступствамі. Дзецям распавялі аб тым, як праходзіла эвакуацыя насельніцтва, дэзактывацыя заражонай тэрыторыі, як паўплывала радыяцыя на здароўе людзей і прыроду. Таксама бібліятэкар расказала пра тое, як складаецца далейшы лёс Чарнобыльскай станцыі.

**26 красавіка** ў чытальнай зале аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** з вучнямі 6-га класа ДУА ”Сярэдняя школа №1 г. Гарадка ім. І. Х. Баграмяна” прайшоў **круглы стол “Што значыць быць валанцёрам?”.** Вядучая (бібліятэкар чытальнай залы) адкрыла мерапрыемства з пытання – “Хто такі валанцёр?”, а затым дзеці былі больш падрабязна азнаёмлены з паняццем “Валанцёрства”. Навучэнцам раздалі карткі, на якіх былі запісаны якасці характару чалавека, а дзеці назвалі, якімі рысамі характару павінен валодаць валанцёр, якую валанцёрскую працу могуць выконваць самі яны ў іх узросце. Удзельнікі мерапрыемства гулялі ў гульні “Скажы добрае слова”, “Чараўнік” і “Старэнькая бабуля”. Таксама шасцікласнікам было прапанавана паглядзець мультфільм аб працы валанцёраў “Рука дапамогі”. Потым усе разам успомнілі аб сваіх добрых справах, і добрых учынках сваіх таварышаў. На працягу ўсяго мерапрыемства ўдзельнікі размаўлялі аб дабрыні, аб дапамозе людзям, аб гуманнасці, аб адкрытасці душы. А напрыканцы была зроблена выснова, што проста так дапамагаць людзям – гэта нармальна, у гэтым праяўляецца чалавечнасць кожнага, і той, хто сапраўды хоча дапамагчы іншым і робіць гэта ад чыстага сэрца, заўсёды знаходзіць такую працу. Не трэба саромецца рабіць добрыя справы.






27 **красавіка** для навучэнцаў 9-11 классаў ГУО “Езярышчанская сярэдняя школа імя П. Э. Анціпава” супрацоўнікі **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** правялі **інфарміну “Достижения библиотек”.** На працягу мерапрыемства бібліятэкар пазнаеміла дзяцей з бібліятэкамі Беларусі. Падлеткі даведаліся аб цікавых фактах з гісторыі бібліятэк, а ў заключэнні быў прапанаваны прагляд відэароліка “Необычные библиотеки мира”.

**27 сакавіка** у **Межанскай бібліятэцы-клубе** была падрыхтавана **выстава-юбілей “Маладосць – пэўнасць крокаў і думаў палёт”**, прысвечаная 70-годдзю з пачатку выдання літаратурна-мастацкага часопіса “Маладосць”.




Спецыялісты аддзела маркетынгу Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк прынялі ўдзел у абласным семінары-практыкуме “Современная библиотека: стратегия работы в социальных медиа”.

**28 красавіка** ў ДУК **“Гарадоцкі культурно-асветніцкі центр і сеть публічных бібліотек”** прайшоў **семінар бібліятэчных работнікаў “Работа библиотек в рамках Года мира и созидания”,** у якім прынялі ўдзел работнікі бібліятэк Гарадоцкага раёна. “О взаимодействии учреждений культуры с субъектами профилактики” расказала галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гарадоцкага райвыканкама Быцко С. Ю. Таксама былі праведзены: майстар-клас па правядзенні агляду літаратуры патрыятычнай тэматыкі, падведзены вынікі раённага этапа конкурсу бібліятэчных дзіцячых гульнявых праграм “Затея”. Удзельнікі семінара абмяняліся досведам і прыўнеслі свае ідэі і прапановы ў працу бібліятэкі. Сустрэча завяршылася экскурсіяй у Гарадоцкі краязнаўчы музей у залу “Дорогами Победы”. Семінар прайшоў у сяброўскай і канструктыўнай атмасферы, і кожны з удзельнікаў атрымаў новы досвед і веды, якія дапамогуць ім зрабіць сваю работу больш эфектыўнай і цікавай для наведвальнікаў.



**28 красавіка** ў рамках мэтавай праграмы “В интересах села” сумесна з КУСХП імя Свярдлова бібліятэкары **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** правялі свята **першай баразны“Засеўкі”.** Прысутным расказалі, што гэты абрад дае пачатак масавым палявым работам, якім некалі нашы продкі імкнуліся забяспечыць багаты ўраджай.